


# Яраслаў Вырхліцкі

## Выбраная паэзія

*паэты планеты*



# Яраслаў Выpхліцкі

## Выбраная паэзія

*Пераклад з чэшскай*
*Лявона Баршчэўскага*

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2017

УДК 821.162.3-1
ББК 84(4Чех)-5
В92

Серыя заснаваная ў 2016 годзе.

Рэдкалегія серыі:

Л. Баршчэўскі, Зм. Колас, В. Сёмуха,
А. Хадановіч, Г. Янкута

Пераклады зроблены паводле выданняў:

Vrchlický, J. *Básně I, II*. Praha: Československý spisovatel, 1953.

На вокладцы:

*Ян Вілімэк,*
*Партрэт Яраслава Вырхліцкага, 1840.*

MINISTERSTVO KULTURY

Выданне ажыццёўленае пры падтрымцы
Міністэрства культуры Чэшскай рэспублікі.

ISBN 978-985-7164-49-3

©Дызайн серыі. Русецкі М. І., 2016.
©Афармленне. Выдавец Зміцер
Колас, 2017.

## *Fata morgana*

Блукае каганца святло, мільгае,
Пачуццяў даўніх барацьба ў душы...
Гучаць размова ветру пачынае
Шалёнага – у сіняве, ў цішы́.
Я да святла схілю свой твар, аддана
Слязамі выплачуся, і тады
У змроку знікнуць, як fata morgana,
Дзівосных з’яў, што ўзнесліся, сляды.

І гранне струн, і залатое ззянне,
Вабноты дамскай вечнай пекнаты
Разбураныя замкі спадзяванняў,
Ды ў змроку пробліск: пераможаш ты!
Згас каганец ад ветру, адыграна
Дарэшты роля сумная жыцця.
Ўсё ж мне здаецца: як fata morgana,
Ўзнясецца вечны сэнс іншабыцця.

## ***Матулі***

*(Matce)*

Глянь: мая песня ледзь над светам
Узнеслася, й дрыжыць яна,
Ў цябе ж, матуля, белым кветам
Зіхціць на скронях сівізна.

Сівееш хутка ты – паволі
Імкнецца верш да лаўраў мой...
О, маці! Ласка твая болей
Каштуе – ад амбітных мрой!

## *Гандальера*
*(Gondoliéra)*

Той вобраз мрояй праступае,
З юных дзён каля Бенаткі[1] –
Ён у тумане залунае,
Ўзбудзіць залатыя згадкі...

Глянь, поўня ў небе, нібы мроя,
Для іх зіхціць...
Ах, каб была ты тут са мною,
Мяне б ты цалавала – тое
Так мусіць быць!

Ты чуеш, люду спеў забыты
Нам адгукнуўся – і ў працяг
Ён берагу азваўся, зліты
З пачуццямі ў маіх грудзях.

Зноў з ім я поўнюся тугою –
Мой дух не спіць...
Ах, каб была ты тут са мною,
Мне б клала скронь на грудзі – тое
Так мусіць быць!

---

[1] Назва возера ў Пльзеньскім краі ў Чэхіі.

Глядзелі б разам мы на хвалі –
Як зоры свецяць над вадой,
Каб шчасця пробліскі заззялі
І прасвятлілі позірк твой,

І дзве душы – маю з тваёю –
Маглі зрадніць
Ах, каб была ты тут са мною,
Нам раем ноч заззяла б – тое
Так мусіць быць!

## *Dolce far niente*[1]

Сяброўкаю старой вярба
Схілілася над намі.
Спакой. Адно душа гарыць
Дзівоснымі агнямі.

Ці хочаш бачыць той агонь? –
Сядзь да мяне й зірні ты:
Пячэ ўжо й сонца гарачэй,
Чым бліжай да зеніту.

Нябёсаў шырыцца блакіт,
На сонцы ззяюць скалы.
Ці ўсмешка пекная твая
Ў паглядзе запалала?

[1] Нішто не дае асалоды (*іт.*).

## *У салодкай журбоце*

*(V sladké touze)*

Сонца зайшло, і гор сілуэт
Моцна пабляк; там, дзе строма,
Цёмныя вольхі ўсё між сабой
Гутарылі пакрыёма.

Лісце дрыжала пад поўняю,
Ўчуўшы размову тую –
Ў вочы загледжуся я твае,
Лоб твой і твар абцалую –

Будзеш туліцца да мяне
Так, як да дрэўца – дрэўца;
Ў ласках тваіх спачне маё
Моцна збалелае сэрца.

Ці там мільгнуў твой белы ўбор,
Ці то ад дому цені?

Сэрца крануўся я, ды ўсё
Знікла – у тое ж імгненне.

## ***Эклога***
*(Ekloga)*

Парк вечаровы вартуюць прысады,
Лісце жаўцее – цалюткія горы,
Быццам бы ўзімку, падчас снегападу,
Ў іх нібы чысцяцца зоры.

Падае лісце на поле... Ў сутонні
Гоняць паволі жывёлу,
Дый і зямля – быццам хіліцца скроняй
Зморана ў лісце, дадолу.

І павуціння бязважкая сетка
Па-над палеткам віецца асеннім:
Тут я хацеў бы з табой, мая дзетка,
Цешыцца зорак мігценнем,

Ціхім ляском, дзе зіма насцілае
Саван-туман на паляны,
Ззяннем вачэй, у якіх спачывае
Травень салодкі, духмяны...

***

*(Mně v hloubi srdce vždycky láska zpívá...)*

Мне песню пра мілосць душа спявае –
Без песні той я – голы дуб асенні.
Дзявочым вуснам, што заўжды ў цвіценні,
Таксама любасная песня тая.

Я ж без цябе, галубка залатая,
Ў жыцці не ведаў ад пакут збавення.
З табой жа – зведаў радасць захапленне,
Як птах, што золак песняю вітае.

Я песняю тваёй крануўся скроні
І з песняй кветку ў косы ўплёў табе я,
І з песняй абдымаў цябе сягоння.

Мы разам. І, хай цемра наступае –
Табе слязінкі не заросяць веяў:
Мне песню пра мілосць душа спявае.

## ***Лілея***
*(Lilie)*

Белая лілея ў вазе стаіць на стале,
Нібы келіх тоне ў месяцавым святле.

З бояззю гляджу я: голае цела яе
Як бы з чашы празрыстае прад вачмі паўстае.

## *Прыпавесць*
*(Podobenství)*

Віно ў бакале ўбачу – твае ўзгадаю косы:
І там, і там мільгае, залоціць тая ж россып...

Віно ў бакале ўбачу – твае ўзгадаю вусны:
І там, і там рубінам завабяць так спакусна...

Твае ўзгадаю грудзі – ўваччу віно паўстане:
Ад іх збягае хваляў гарачае дыханне...

Ды вочы твае ў думках і мроях без супынку:
Як ад віна, мне ў сэрца ляціць ад іх іскрынка...

Не холад і не пена, а толькі новы трунак
Злагодзяць жар у сэрцы – і новы пацалунак.

## *Летняя ноч*

*(Letní noc)*

Ліпеньская ноч стаяла, шэрай грудай аблакі
Ўпалі на зямлю раптоўна, чый пусты быў сон такі:

Дзе ні месяца, ні птахаў, а праклён паветра здзьмуў –
Камяністая планета, згаслая сто год таму.

Ты спала ў маіх абдымках; адступаў змрок дзе-нідзе,
Сцягваў, быццам грыф драпежны,
покрыва з тваіх грудзей.

Я адчуў: цябе ў абдоймах зараз нешта скалане –
І знямеў, нібы маланка ўдарыла ў калені мне.

## *Вечаровая малітва закаханых*

*(Večerní modlitba milujících)*

Шпурляеш ты ў блакіт, анёлак мілы,
Дажджынкі зор каля Любві вытокаў –
Нас абаіх жа... ты вазьмі пад крылы:
Спачыць мы хочам, сцішана й глыбока.

Вунь Млечны Шлях чароўна-зіхатлівы,
Як вочы з бездані душы, нам свеціць.
Накрый нас крыламі. Ты – нешчаслівы:
Не ведаеш, што значыць – жыць на свеце!

## ***Строфы***

*(Sloky)*

Калі ў глыбінях мора зоркі спяць
  І неадзетыя жанчыны,
Як ліры, на каленях у мужчын, дрыжаць,
  Калі навокал праз даліны
Даносіцца звон срэбны ручаёў,
Калі тужлівы пошчак салаўёў
  Гучыць-пераліваецца няспынна –

Міргаюць знічкі, я стаю каля вады:
  У думках – мроі-летуценні.
Я – кропка ў космаце – не ведаю, куды
  Лячу і што мяне сустрэне.
Адно што ведаю – птушыны спеў,
Жанчын дрыжанне, водару вясны павеў.
  І ўсё я абдымаю ў захапленні!

## *Верашчагін*[1]

*(Vereščagin)*

Магілы, чарапы ды косці ў грудзе...
«Не прыгажосць тут – жудасць!» – кажуць людзі.
Я ж ведаю: і ў будучым стагоддзі
Страх будзе ўсё ў людскім жыць асяроддзі
Ад тых злачынстваў, што ў ягоны пэндзаль
Уклалі фарбы гневу, помсты, нэндзы.
Пракляцце, чалавецтва, ты спазнала –
І ўслед за Дантэ, ўслед за Ювеналам
Цяпер, зірні, суддзя прыходзіць новы,
Каб вынесці табе прысуд суровы,
Які не патрабуе тлумачэння...
І кроў твая даходзіць да кіпення,
Бо ты ж так прагнеш літасці да люду,
Які ў сумётах гіне скрозь. Паўсюды,
Галечаю бязмежнаю сагнуты.
О люд!
          Ты церпіш гэткія пакуты,
Калі ідзеш наперад, крок за крокам,
Праз Часу плынь, цераз прадонне Змроку

[1] Васіль Верашчагін (1842–1904)– расійскі мастак батальна-апакаліптычнага жанру.

Туды, дзе Духу ўзлёт перамагае –
А да крыві сваёй душа твая глухая.
І, хоць тваe ахвяры немалыя,
Табе не скінуць ваўкалака з шыі,
Што смокча кроў з цябе. Макрэе глеба
Ад той крыві – і чырванее неба.
Ды перад гідраю-вайною шлях адкрыты.
...Як пэндзаль напісаў таленавіта
Касцей крывавых эпапею! Гэта –
Мяжа, о людзі, вашае асветы,
Прагрэсу, вынаходак... Бо няспынна
Расце ў вас людзі, згубная пухліна.
Адно мастак сказаць знаходзіць сродкі,
Што слёзы кракадзілавы лье ўсё-ткі
Ваш гуманізм. Ілжывыя таксама
Ўсе вашыя лякарні, школы, храмы...
Чаго навукі вартыя ў часіну,
Калі шалеюць войны без супыну!

## *Сялянскі «Ойча наш»*

*(Selský Otčenáš)*

ОЙЧА НАШ, ТЫ, ШТО Ў НЯБЁСАХ, чалом
Мы табе б’ём у пакоры:
Нас пакідалі ў пекла жыўцом,
Столькі сцярпелі мы гора –
   Ўсе, хто ахвочы,
   Бэсціць нас хоча.
Нашы паны – спрэс адны жывадзёры.

Вечна СВЯЦІСЯ ІМЯ ТВАЁ...
Божухна, дай нам патолі.
Шчасна ПРЫЙДЗІ ВАЛАДАРСТВА ТВАЁ –
Сілай напоўні паболей
   Нашыя грудзі:
   Ты ж – бацька людзям.
Голад нас нішчыць, бы птаха ў няволі.

«ХАЙ БУДЗЕ ВОЛЯ ТВАЯ», – зноў і зноў
Чутна ў святарскіх казаннях.
Ды, хоць заўжды мясаед у паноў,
З голаду гінуць сяляне.
   Можа, даволі?
   Хай твая воля
Ўрэшце мацнейшай за панскую стане!

ХЛЕБУ НАДЗЁННАГА ДАЙ, – так штодня
Просім цябе мы ў маркоце.

Нават і птушкі, што ў небе звіняць,
Крошкі раз-пораз знаходзяць.
   Мы ж – днём працуем,
   Рук, ног не чуем,
Ну, а пад вечар нам пугай заплоцяць.

НАШЫ ГРАХІ АДПУСЦІ, а й паны
Маюць грахоў надта многа –
Быць пакараны павінны яны
(Нашу ты ўчуй засцярогу!):
   Мы, люд загнаны
   Ані тыранам,
Ані табе не даруем нічога!

НАС ТЫ НЕ ЎВОДЗЬ У СПАКУСУ, каб мы
Век бедавалі ў гароце,
Быдлам былі і глухім, і нямым,
Дзетак вучылі ўсялякай брыдоце,
   Слеплі ад пылу
   Ў працы панылай
Ды, як жывёлы, каналі ў балоце.

ЗБАЎ НАС АД ЗЛОГА – ад чыншу, даўгоў
І ад жандараў таксама.
Хлебу пашлі нам, а нашых паноў
Лепей павесіць на брамах!
   Толькі сяляне
   Схочуць– і стане
Царствам нябесным зямля наша. А́МАН.

## *Свабода*

*(Volnost)*

Краса, маладосць і свабода начной
Парою няветлай аднойчы
У жылах мне кроў запалілі, са мной
Змагаючыся ахвоча.

Ў адной у руцэ быў п’янючы бакал,
Другая трымала ў ёй ружы.
У трэцяй – скрываўлены быў кінжал –
Лятунак харобрага мужа.

Краса? Маладосць? Ад іх згіне і знак,
У часе ды модзе іх сіла...
А вольнасць заўсёдная, вечная, як
Анёл, што ўздымае й з магілы!

А верне яе чалавек – як ёсць,
У ззянні праменным сонца –
Ў аблічча яе і краса, й маладосць
Між нас застануцца бясконца!

## ***Пастэль***
*(Pastel)*

Стракацяць у полі вышыванкі –
То з імшы вяртаюцца сялянкі.

Глянь, па сцежцы, ў зеленню багатай
Руні хваляю ідуць стракатай.

Дзікі мак, валошак шмат... здалёку
Колеры – што ледзь не страціш зроку!

Ўброаў тых вясёлых гэтак многа,
Тут жа – яблыні ды квецень глогу.

Кожным подыхам ім ветрык павявае,
Ў сіняве нябёс жаўрук спявае.

## *Notturno*

Каб толькі ведаў: ты не спіш,
К табе тады ж

Прыйшоў бы я, а так я рад,
Што зоркапад...

Каб чуць мне: на галінках, ах!
Спявае птах

І між імхоў, паводдаль дрэў, –
Крынічкі спеў,

На дыбачках у цемнаце
Рой мрой ідзе.

## *Andante*

Хай, як пялёстак у лілеі,
На клавішах рука спачне.
Прамовіць слова, гук не ўмее
Ўсё, што мне грудзі рве. Ды не,

Не зык – адно ледзь-ледзь дрыжанне
Парванай з віскатам струны,
Ці пацалункі, у маўчанні,
У пекнай вечнасці, адны...

Паціснуць рукі, пакланіцца,
Спяшаючыся, ўжо ў дзвярах,
І бегчы ў вэрхал навальніцы,
Спыніцца ж – толькі на кладах.

Ці лепш на бітву ўстаць паспею,
А боль павесяліць мяне?
Рука пялёсткам хай лілеі
На клавішах цяпер спачне.

## *Apassionato*

Душы дай наспявацца ўволю,
Чароўным упіцца сном!
Два гукі ўзніклі паволі
Ў глушы – й загучалі мне днём!

Адзін з грудзей тваіх ліўся
І з губ тваіх зноў і зноў;
Другі ж – праз Бога стварыўся
І ў мозг мне ўвайшоў, і ў кроў.

Абдымкі нас захапілі,
Ў тых гуках шаленства гуло
Я чуць буду іх і ў магіле,
І колькі б гадоў ні прайшло!

## ***Ікар***

*(Ikarus)*

Яго падзенне ўзнёслае – бы ўзлёт!
Туды ляцеў ён, дзе паэтаў боль,
Дзе боскі той Алімп – ды ў крылах больш
Не стала моцы – й скончыўся палёт.
Каб так было, й ляцеў у Вышні Свет,
Як я, і падаў стуль любы паэт
На ўлонне мяккае такіх прыгод!

***

*(Jdou mračna přes hor vrcholy...)*

Мкнуць хмары паўз вяршыні гор,
Дзіцятка!
Мкнуць хмары паўз вяршыні гор
Імкліва – іх і не спыніць.
Спытаў я: «Ці магу цябе любіць,
Дзіцятка?»
«Ніколі!» – ты мне насупор
Сказала, й я амаль замёр,
Дзіцятка!

Ў змрок – поўні вымкнула святло,
Дзіцятка!
Ў змрок – поўні вымкнула святло,
Так позірк твой зіхоткім стаў,
Як пра каханне я спытаў,
І мне надзеі прыбыло:
Ў ім штосьці няўлоўнае было,
Дзіцятка!

Пра што ж таполі нам шумяць,
Дзіцятка?
Пра што ж таполі нам шумяць? –
Ах, ведалі яны й даўней,
Што сэрца сэрцу намякне,

Дзіцятка!
Не стануць вусны адмаўляць,
Перш чым душа пачне гукаць,
Дзіцятка...

## *Песня*
*(Píseň)*

Цябе я затуліць хачу ўсім целам,
Стаць купай хмар прад ліўнем веснавым,
Быць птахам, пчолкай, матыльком нясмелым
На целе на тваім, на целе на тваім.

Узяў бы птах на спеў твой голас ясны,
Твае трымценне ўзяў бы матылёк,
Па пацалунках мёд пчала б ляцела шчасна –
Хоць зблізку, хоць здалёк, хоць зблізку, хоць здалёк!

Цябе б душой я ахінуў сваёю,
Як бура, што зрывае квецень з дрэў,
Каб матыльком там, птахам ці пчалою
Я ўсё ж пабыць паспеў, я ўсё ж пабыць паспеў!

Прынёс бы птах драбок пачуццяў мілых,
Пчала ўзняла б дзіцячых скрух пылок,
Тваёй усмешкаю б аздобіў крылы
Той матылёк, той матылёк!

## *Ідылія могілак*

*(Idyla hřbitovní)*

На могілках старых на лаўцы нізкай
Мы селі побач, свет вясной смяяўся блізкай,
Ігрушы срэбрам там і сям зіхцелі,
А яблынькі пяшчотна ружавелі.
Чаромхі куст квет сыпаў што ёсць сілы,
Залеваю на кветнікі й магілы,
На мур, крыжы, на помнікаў падмосткі –
Ўсе сцежкі спрэс засыпалі пялёсткі...
Як пах мурог! Як дыхалі прагалы!
Жыццё зноў казкай мне жаданай стала,
Ды я пражыць яго хацеў тым часам
Рука ў руцэ – каб мы з табой сам-насам
Сядзелі доўга тут, і перад намі
Сутонне апускалася б шыхтамі
І сэрцы б нашы ціха раскрывала,
І ўсе турботы нашы, ўсе, бязмала,
Жаданні, боль валокнамі сплятала
Учора, сёння і ад рання і да рання
У доўгае жыццё і існаванне, –
Расказваем сабе мы, гараджане.

## *Казалі: змрок ідзе...*

*(A povídali...)*

Казалі: змрок ідзе ад гор далёкіх,
А гэта валасы твае чарнелі;
У цемры зблытвалі іх крыллем цмокі й
Мне ўцяцца ў сэрца вернае хацелі.

Казалі: з гор шугнула бліскавіца –
Мне ў сэрцы бляск тваіх вачэй іскрыцца.

Сказаць бы ёй – такая думка вабіць, –
Што ёй у сэрца мусіць стрэл патрапіць!

## ***Снегу, што падае...***

*(Padajícímu sněhu)*

Усё ўкруці дазвання
Ў снег, імглу; не след
Нават мець ваганні –
Не заслужыць іншага наш свет.

Сэрцу дай адхланне,
Мёртвым змрокам прамільгні,
Збаў маё каханне –
І сабою
Рану маю шчыльна захіні!

***

*(Za trochu lásky šel bych světa kráj...)*

Па кропельку мілосці я на светакрай
Ішоў бы нават босы, з голай галавою –
Праз снег і льды – але ў душы заўсёдны май,
Праз буры – але з песняй птахаў веснавою,
Праз суш – ды ўсё ж амыты светлаю расою.
Па кропельку мілосці я на светакрай,
Як той, ішоў бы, што пяе з працягнутай рукою.

## *Апастрофа*

*(Apostrofa)*

Мілосць, я грукаў часта ў дзверы
Як валацуга, ўпрост,
Табе – ды, ў страху і няверы,
Укленчваў, вочы поўны слёз...

Ты, ў дыяментавым палацы,
Глухая да мяне была;
Мой дух не ў моцы
                    быў трымацца,
Рука ад ран крывёй сплыла...

Хацеў я ўжо скарыцца лёсу –
Вяртацца з ганьбай нацянькі,
Нібы Самсон, што безвалосы
Ўраз стаў ад жончынай рукі.

Хацеў бязвольна і нядбайна
Паверыць праўдзе ўсёй тваёй,
Сябе знішчаць у аднастайнай
Нялюдскай працы, дый тупой.

Адкрылася ты? –
                    Ўсе прад табою
Дрыжаць, схіляюць голаў так,
Заранка чалавецтва; ў збоі
І я ніхто – нібы чарвяк.

Ці лепш, каб зноў навідавоку
Я ў дзверы грукаў да цябе –
Хай ззяў бы твор мне твой здалёку,
А ідэал – цьмянеў, слабеў...

## ***Уверцюра***

*(Ouvertura)*

Камедыі траўня старое
Пачатак: зіхценне, квет, спеў,
Цудоўнае гранне такое...
А й душам падман як прыспеў!

З ёй так жа, як з мілосцю – вечны
Падман ізноў з гульнёй старой:
На лбе маршчынкі, боль сардэчны,
А прыйдзе – ты скарышся ёй...

***

*(Stín tmavý na řece...)*

Цень цьмяны на рацэ – ад воблакаў свінцовых –
Дрыжыць і па вадзе святлінкі рассявае.
Цень цьмяны на душы – ад бед, пакут суровых –
Ўзнімаецца ўва мне чарней, як ноч сляпая.

Цень цьмяны на рацэ яшчэ зіхціць агнямі,
Ды хутка шчыльны змрок атуліць наваколле.
Цень цьмяны на душы чарнотай думкі пляміць,
І спевам, як вяслом, ты не адгоніш болю.

Цень цьмяны на рацэ па чоўне разальецца
І срэбрынкі святла да берага пакоціць.
Цень цьмяны на душы... ён толькі адаб’ецца
У подыху вярбін і ў сумнай іх пяшчоце.

***

*(Jen chtěl jsem říci...)*

Сказаў бы толькі я, ў тузе такой салодкай:
Ах, стань дзень без цябе ўраз хвіляю кароткай!

Сказаў бы толькі я, хоць клопату нямала:
Хачу, каб лепшым ты ў душы мяне ўяўляла.

Сказаў бы толькі я: ў маіх радках мілосці
Ані не хопіць слоў патрэбнай прыгажосці...

Сказаў бы толькі я: жыць не хачу ў падма́не,
Ды ведаеш сама: не падмане́ каханне.

Сказаў бы толькі я... ды ўжо найлепшы трунак
Я з вуснаў п’ю тваіх – пяшчотны пацалунак!

***

*(O, krásní dnové...)*

О, тыя дні цудоўныя з табою,
Калі да вуснаў вусны прыпадалі,
Калі рука ў руцэ і вочы – з варажбою,
А ночы... ці ж мы лепшыя ўяўлялі?!

Каб ночы лепшыя... ўявіць такое
Нам даць не здольнае жыццё зямное!

Ах, ночы тыя, і тваё дыханне...
А й дні цяпер нам – проста святкаванне!

***

*(V tvém oku jindy zamlklém a snivém...)*

Мае абдоймы – для цябе: глыбокі
Твой часам сон і мройлівы такі;
Натоўп дамавічкоў сарвецца ў скокі
І разбяжыцца ў розныя бакі.

Пакажа той мне алябастар тваёй шыі,
А іншы – выгін хвалісты грудзей,
А хтось – пагляду ножку прыадкрые,
Што вартая найпрыгажэйшай з фей.

А нехта мне рукі сваёй узычыць
І павядзе да шчасця пекнаты,
А хтосьці той, што пацалункі лічыць,
Шапне мне ў вуха: ўсё даруеш ты...

## *Каля Лабы*

*(Nad Labem)*

Дні мае бягуць, як хвалі –
Аднастайна, манатонна.
Толькі зрэдку ўночы зіркне
Маладзік любві замглёны.

Ах, чаму ж вы, Лабы хвалі,
Так гамоніце маркотна?
Вы ў жыцці заўсёды разам,
Я ж – іду па ім самотны.

Вы шумелі ў снах дзіцяці –
Ён цяпер ужо мужчына.
Даўніх ран боль несуцішны,
Хваляў новых бег няспынны.

## ***Песня***

*(Píseň)*

Дзень ледзь чутным напевам
Сплыў, аддаўся начы...
Ша! Лес шэпча, павевам
Ціхі шум несучы.

Неба вунь, гэтак нізка –
І, здаецца, грыміць...
Адчуваю: ты блізка,
Толькі дзень адгарыць.

Барвы свету і зоры
Дзён тваіх і начэй
Зззяюць мне – ў шчасці, ў горы –
Глыб’ю тваіх вачэй.

## *У прысадах каштанаў*

*(V kaštanové aleji)*

Робяць прысады з лісця́ апранахі –
Вернуцца хутка вандроўныя птахі.

З'явяцца птахі, й гнёздам заслонай
Стане лістота – шатай зялёнай.

Потым жа прыйдуць нацешыцца ценем
Тыя, што бачацца тут з захапленнем...

Доўгімі будуць стаянне, абдоймы –
Аж покуль зорак засвецяцца плоймы.

Месцейка ўтульнае створаць прысады
Квеценню, лісцем – ім для прынады.

І праспяваюць ім птахі ахвоча
Песні на золку, увечары, ўночы.

Будзе й паветра спрыяць тым уцехам...
І пацалункі разыдуцца рэхам.

Кожны, пацІху прысады мінуўшы,
Гэтае шчасце адчуе, ўдыхнуўшы.

## ***Вечар***

*(Večer)*

У светлы дзень, што нібы казка кожны,
Ў лагоднасці і цішыні залеве
Душа мая з удзячнасцю пабожнай,
Як ружы квецень, прарастае ў спеве.

Святло ўсё, што зіхціць у водных нетрах,
Жарынкі ўсюды ўдзячна раскідае.
З падзякай сонцу, росам і паветру
Вам, птушкі, лес акрылена гукае.

Свет ува мне – схаваныя паклады,
Ці ў папараці лясной крыніца.
О думкі зорныя! Быць шчасным рады
Я – й з тым ніколі не спазніцца!

## ***Снег***

*(Sníh)*

Чым снег ёсць, знаеш? – Дзьмухаўцы ў нябесным
Абшары сталі гожым радам цесным.
Як адцвітуць, задзьмухае вясёла
Ў пушынкі іхнія анёльскі хор...
    Уверсе і наўкола
Ахутае раўніны, схілы гор
І ляжа на карнізы, на галінкі
    Снег.

## ***Міла***
*(Mila)*

Увесну квецень шмат упрэгла
Ружовых, белых чараў –
Бы праз які заклён, набегла
Ў душу дзівосных мараў...

Ёй валасы рукой дрыготка
Я гладжу, і палае
Мая ў яе вачах усё-ткі
Юнацтва жарсць былая.

## ***Над прадоннем***

*(Nad propastí)*

Стаю над прорвай часта – і таемна
Ў сябе пытаю: скіну *што* ў прадонне –
Ў сябе мо веру, ў ідэал, людзей?
Жыццё сваё, што так пражыў нікчэмна?
Ды чую я ў глыбінным нетраў звоне:
Скінь баязлівасць ды – ідзі далей!

## *Мелодыя*
*(Melodie)*

Балела ўсё, балела,
Сэрца пад тым замлела.
Сёння ж боль той аслабеў.
Думак болей:
Як таполі
З мрояў, увайшлі ў цябе.

Даймала ўсё, даймала,
Сэрца ў тым рай шукала.
Ах, рай страчаны святы!
Знак здалёку...
Ззянне ў змроку,
Як сутунак залаты.

А шолах – той парою
Хацеў бы йсці за мною.
Ёсць неабходнасць ва ўсім,
Што лунае,
Што спявае,
Што свет паглыне зусім...

## *Песня*

*(Píseň)*

Ах, жаль і скруха мкнецца да людзей,
Месяцам паўзе на горы! –
Мы ведаем... ды іх адкінь барждджэй!
Мілосць, ладдзёю стань на моры.

Як скрухі й жалю прыйдуць зноў часы,
Ўзгадай мяне... ці хоць імгненні,
Як я твае пагладжваў валасы,
Як пры табе я летуценіў!

Ах, месяц! Ах, месяц! Хай скруха ды жаль
Да гор, да людзей імкнуцца!
Што летуценні! Праўда ў тым, мараль,
Што вусны нашы сальюцца...

## *Інтымныя імгненні*

*(Intimní chvíle)*

Адно ля аднаго мы шчыльна сядзем
І ў твар зіме, і ў твар вясне пагля́дзім:
Адмерла што, што квеценню ўзбуяла,
А ўсё ж інакшым стала!

Мы сёння разумеем: на дарозе
Жыццёвай мы вярнуць ужо не ў змозе
Таго, што сум, лянота ў нас забрала!
А ўсё ж інакшым стала!

Спазналі мы ў жыцці раскошы мора,
Надзей, юнацтва пекнату і – гора.
І ў сэрцы смутак пасяліўся стала –

Ўсё ж сёння іншым стала!

Усё ў мінулым тое. Звер стамлёны
Ды хціві падганяе нас да скону,
Дзе вечны цень каля Аіду скалаў –
То ўсё ж інакшым стала!

Цяпер больш значыць поціск рук ды словы
І больш баліць нялад жыцця суровы.
Ў абдымках простых бачыш болей знаку –
Ўсё іншае ўжо – й дзякуй!

## *Інтымныя строфы*

*(Intimní sloky)*

Каб квітнела зноў я, любы,
Песцімася губы ў губы!

Каб я расцвіла нанова,
Мне адно патрэбна слова...

Я чакаю, я марнею...
Ты маўчыш? – Не расквітнею!

## *Сэрца чалавека*
*(Lidské srdce)*

Крэмень у латку жыцця –
Сэрца чалавека:
Ўспыхвае на знак зліцця
Бляску зор адвеку.

Жарсць успыхвае, гарыць,
Як вясёлка, грае.
Крэмень цвёрды – унутры
І шурпаты – з краю.

## ***Паэт і філолаг***

*(Básník a filolog)*

Простае дзіця філолаг: для яго агмень – гульня,
А паэту ён патрэбны, каб агонь шугаў штодня.
І шукае ўсё філолаг
Існасць словаў небачолых,
А паэт – каб яго жарсна і аберуч хто абняў...

## ***Сэрца***
*(Srdce)*

Сэрца ў дамы – нібы ваза тонкая,
Колерамі грае шкло ў ім звонкае.
Спешчаная ручка дакранаецца
Да яе – і ваза разбіваецца.
Сердалік-крывавец – то сэрца мужчынскае,
Ваяўнічай годнасцю паблісквае,
Дама слёзку – полымя! – як выцісне,
Камень гэты на кавалкі пырскае.

## *Гераклу*
*(Heraklovi)*

Нашто к табе вяртаюся ўвесь час,
О ты, адзіны між людзей вялікі?
Адно, бо я патрэбу адчуваю
Геракла мець у свеце збэшчаным!
Убачыўшы, што нас даймае, нішчыць,
Дванаццаць подзвігаў прадоўжыў ты б –
Усё б ачысціў і павыбіваў,
Як Дзэўс бы ўзяў грымотнае жазло
І збавіў нас ад бруду, львоў ярма,
Ад гідраў і ад стымфалійскіх птахаў.

О, каб жа Богу ў галаве было
Глядзець на справы нашыя з вышыняў
Паслаў бы ён тады героя нам,
Што мог бы збавіць свет, які,
Нібы вялізныя Аўгія стайні,
Сплывае гноем і мацней смярдзіць...

І справядлівы быў ты, і мацак –
Цяпер шмат справядлівых – слабакоў!
І ў тым стагоддзя нашага праклён.
Каб мець стралу на гідру тую нам,
Што выпівае, смокча нашу кроў,
Каб фанатычна разам з дзецьмі

Нас праглынуць; каб мецьнам заступ твой
На той Аўгіеў хлеў вялікі,
Дзе плоймы павукоў плятуць, ля столі,
Нянавісць, забабоны, подласць, глум,
Зло супраць сваякоў – братоў, бацькоў, –
Дзе выпарэнні ўзносяцца да неба
Атрутныя – і дыхаць няма чым.
І як да яблыкаў дабрацца Гесперыд
Магчыма ўвогуле, калі ты рухацца
Па хлеве гэтым будзеш?

Мой герой,
Каб жыў ты з намі, у сучаснай вопратцы,
Твой час бы йшоў. О, ўцелясніся:
Свет будзе, як раней – адно прыйдзі!
Не, не Напалеон, не Тамерлан:
Яны прыйшлі, як цені, адышлі –
Прыйдзі, Геракле! Чалавек вялікі,
Прыйдзі! Чакае свет – Аўгіеў хлеў.

## *Малітва перад сном*

*(Modlitba před usnutím)*

Магла мяне ты, ў разе кожным,
Не ведаць, іншым жыць жыццём –
Вядома. Я ж – з тым пераможным
Жыць буду вечна пачуццём.

Зноў з ім я грукаюся ў дзверы,
Каб мілы голас твой пачуць.
Мне адгукніся! з гэтай верай
Спакойна я змагу заснуць.

## ***Пастараль***

*(Pastorále)*

Ад кіпарысаў дзіўна
Лёг цень на летні луг,
Гук флейты й мандаліны
Ўздыхнуўшы, не затух.

І безліч пацалункаў –
У паўзах той ігры,
А рыфмы ўсе – ў сутунку
Дзівоснае пары.

Цень кіпарыса ляжа –
Адыдзе змрок магіл.
Цалуймася, аднак жа,
Што ёсць пачуццяў, сіл!

## *Веснавыя імгненні*

*(Jarní chvíle)*

Чаму іхні настрой спакойны гэты
Нам цікавейшы за буянне лета?
Чаму пралесак, каташкоў, пупышак
І руні маладой эмоцый лішак
Дае нам і куды больш сэрцу мілы
За лад прыгожы лета – сыты ды панылы?
Дзяўчо ад дамы выглядае больш вясёлай,
Краса пад вэлюмам больш звабная – ад голай.
Нябачанае вабіць навізною...

Лаўлю вас – падлятайце бліжай, мроі!

***

*(Ublížilas, lásko...)*

Ты, мілосць, нанесла рану сэрцу,
Што табе дарэшты аддалося
Мілы Божа! Чэзну ў паняверцы:
Болю шмат, а сіл не засталося.

Ў горы, ў поле я ішоў панылa,
Зелля гойнага шукаў на гоні,
Што б, мілосць, хоць трошкі асцюдзіла
Жар, які пячэ з тваёй далоні.

Я прайшоў – хто злічыць рэкі тыя
Ці палетак, ці пралесак кожны?..
Марна ў каласы лез залатыя:
Захінуць чароўны квет няможна.

Мне йсці з гэтай ранай да магілы,
Загаіць, а як? Я ў паняверцы,
Лёс адцяў далонню птаху крылы,
Ты, мілосць, нанесла рану сэрцу...

## *Конь*
*(Kůň)*

Як мне шкада, прарокі чалавецтва,
Вас, хто ў руцэ трымае пальму міру
Пад німбам будучай і вечнай славы!
Вы міру патрабуеце, а людзі
Далей ідуць дарогай цемрашальства
І варварства. Я ўжо амаль паверыў,
Што чалавек – нягоднік па натуры.
І тое, што аднойчы адбылося
На досвітку дваццатага стагоддзя,
Мае пацвердзіць словы:
Два слупы
Ў зямлю ўкапалі, а між імі – трэці.
Да іх каня вяроўкай прывязалі
Жывога, каб падвіс ён у паветры,
І пачалі страляць па ім са стрэльбаў
З пяці дзясяткаў метраў, каб праверыць,
Як забіваюць новыя набоі.
Конь кідаўся ў бакі ды гігатаў,
Прывязаны – а ўсё было дарэмна,
Бо ў гэты міг жаўнер-вусач пацэліў
І стрэліў. Можа, нават здрыгануўся,
Бо сынам быў вяскоўца сам і колісь
Ён за канём амаль такім жа самым

Хадзіў раллёй па бацькавым палетку,
А тут вось – мусіў па кані страляць,
Каб даказаць, як можа адмыслова
Расшкуматаць і сэрца чалавека
Набой той новы – вынаходка д'ябла
На досвітку дваццатага стагоддзя.
І той жаўнер, калі наводзіў стрэльбу,
Адчуў, як па шчацэ яго пабегла
Гарачая сляза, ды стрэліць мусіў
Ён па кані, які ўсё рваўся і дрыжаў.
Стрэл прагучаў, і конь у тых вяроўках
Перакуліўся й хутка сплыў крывёю.
Жаўнер пацэліў добра: ў конскім сэрцы
Пасля знайшлі маленечкую дзірку
Уперадзе, але з другога боку
Вялізная, ў крыві, чарнела рана.
*Набой быў ладны: увайшоў іголкай,*
А потым – разарваў вантробы ўшчэнт.

Як вас шкада, прарокі чалавецтва:
Вы хочаце склікаць кангрэсы міру,
Калі на конях спраўджваюць набоі,
Каб *потым* лепей *на людзях* ішло...

Як вас шкада... Чаго ж вам, людзі, трэба?

## *Будучым паэтам*

*(Budoucím básníkům)*

О, будучых вякоў паэты! Не ў маім жыцці
Што будзеце спяваць вы іншаму ўжо свету?
Ці будзе гімнаў бляск, трыумф у вашым пачуцці,
    о, будучых вякоў паэты?

Для лекавання хворых вы знойдзеце сакрэты,
Медуза да вас звернецца ў гніцці, ў паўзабыцці
Антычным – нібы ззянне зоркі, след планеты...

На вашым месцы быць – ды не зайздросціць у быцці –
Часцінкай космасу ці атамам якой каметы,
Мільгнуць, як светлячок, у шырыні сусвету,
    о, будучых вякоў паэты!

## *Дзецi дэкадансу*
*(Děti dekadence)*

Мы дзеці дэкадансу – гэта ўсё бясспрэчна,
Мы – млявыя, ўсё новыя ўсчынаем танцы,
Ці вершам ці разцом, а прагнем жыць мы вечна,
  Мы, дзеці дэкадансу.

Свабоды хочам мы – і пнёмся ўсё ў выгнанцы,
І досыць адчуваем сіл, каб зрушыць горы,
А й каб, як трубадур, спяваць душы рамансы.

Ды мы й падлеглыя рэальнасці напору,

Мы – дошкі ідэалу, плiткі рэзанансу
Мы – толькі пыл буйнога метэора,
  Мы, дзеці дэкадансу.

## *Адказ*
*(Odpověď)*

Інакш я на мілосць гляджу, павер,
Асветлены няўзнак тваёй пяшчотай.
Я як вялікі лес задумлівы цяпер,
Куды жарынка з поўні ўпала ўпотай.

Ап'яненыя летам матылькі
Вісяць на сцёблах кветак і на лісці;
Панылы свет, а й зменлівы такі
Ды цалкам іншы, чым ён быў калісьці.

Губ ягадкі дзявочых мне былі
Як дзіва. Сёння адчуванні
Не свежасці, а спеласці прыйшлі:
Душа трымціць у ціхім развітанні.

## ***Роздум***

*(Rozvaha)*

Цяпер адчуваю: ў жанчыне
Ёсць больш, чым прыгожы твар,
Чым львіцы запал, чым багінін
Пагляду містычны жар.

Мне сэрца больш ясная мова,
Чым колісь – сугучча цел.
Я б марна не траціў словы,
Але б ад пачуццяў трымцеў!

Пры выглядзе ўсмешкі дзіцячай,
Што некуды ўдалеч імкне,
Ў душы б я адно падзячыў
Тым, хто разумее мяне...

## ***Вабноты жанчын***

*(Vnady žen)*

Разнастайнасць іх, вабноты
ці ж які апіша верш?
Веліч у малым, мізэрнасць
у вялікім – што найперш?
Іх, як маку-самасейкі,
шмат на ўскрайку баразны:
Гожа так цвітуць для іншых–
ды не для цябе – яны.
Стань жа стоікам: пакуты
там наперадзе адны...

## *Працяг*

*(Pokračování)*

Маняць з’явы, маняць твары
ўчора, сёння і ўвесь час,
Ці ж маніць было таемствам
тых усіх вабнот штораз?
Паўната грудзей і стану,
мушка на яе шчацэ...
Летуценні! – мецьмеш лекі
ў лыжачцы ў тваёй руцэ...

## *Да вольнае думкі*

*(Volné myšlence)*

Ты плыві, дзіцця нябёсаў, з вышыні да нас плыві,
Пасяліся, увасобся ў бурнай геніяў крыві.
Толькі ты быць можаш мостам, што злучае ўсе
народы
Повяззю здароўя, волі, прыгажосці, сілы, згоды.
Ты масты ўзнясеш, дарогі пракладзеш між стромых
гор,
І па іх аднойчы пойдзе ўнукаў праведны дазор.
Ты ўсміхалася народаў праз бяду, турмы скляпенні –
Дзе ты ўспыхнула, там Слова мовіў Чалавечы Геній.

## ***Праз гады***

*(Po letech)*

Дзень восеньскі пахмурны, у журбоце,
Наш цесны дом – як цёмная магіла...
Табе зірну я ў вочы – і, ў маркоце,
Не веру, што вясна калісь юрыла,

Што некалі была ў нас тут на ганку,
У сэрца спевам увайшла прыцьмёна,
Яна ў табе жыла бесперастанку,
А вусны твае мелі пах бутона.

Гадоў пражытых шмат, іх ледзь адрозніш;
Да тваіх губ схілю я раптам голаў.
Маю руку ты ў свае рукі возьмеш,
Яе пацісні, глянуўшы вясёла.

З люстэрка, што вісіць насупраць, вокам
Ты падміргнеш мне зоркай заблукалай.
Я шчасны зноў – так, як, калі няўрокам
Мне кудзерка твая на грудзі ўпала...

Ў душы былое ўспыхне зноў каханне,
Як ноч праз вокны нас угледзіць разам.
Прашэпчаш ты: «Жыццё ж – замілаванне!»,
Павер, і я не зацягну з адказам.

## ***Пацвельванне***

*(Škádlení)*

Мне казалі: «Ах, старэча!
Ўжо ж не будзь гуллівы?
Ты ж да індыка падобны
Мокрага пад злівай.

Прагнеш ад жыцця чагосьці
Ў змроку непралазным? –
Лепей лезь на курасадню:
Досыць быць тым блазнам!»

З безнадзейнасцю я тое,
Ды спакойна, слухаў:
Праўда ўсё, а робяць песні
Ў сэрцы завіруху.

Не здзіўляйцеся: як нехта
Піў з жывой крыніцы,
То яму й далей няспынна
Хочацца напіцца:

Сэрца мае як фіялку,
Нават пахне ружай:
То жыве нябеснай маннай,
То смуткуе дужа...

Звялую фіялку тую

Ў смецце кінуць трэба:
Толькі пах былы,
                з падзякай,
Узлунае ў неба.

## *Восень кахання*

*(Jeseň lásky)*

Дзівосна-жоўта свеціць сонца так
Праз гушчыню туману й прахалоду.
На гронках сініх кроплі рос дрыжаць няўзнак,
І павуцінкі кідаюць старанна
На валасы нам ніцяў шмат ад рана.
І скура твая, белая такая,
Ўвесь час палае стомленым святлом,
А валасы – як вусік аздабляе
Ад віннага сцябла: у цябе надлом
У сэрцы... Толькі ж бура адступіла –
Пустэча мглы адно й палоска пылу.

# ЗМЕСТ

Fata morgana ........ 5
Матулі ........ 6
Гандальера ........ 7
Dolce far niente ........ 9
У салодкай журбоце ........ 10
Эклога ........ 11
*** (Мне песню пра мілосць душа спявае...) ........ 12
Лілея ........ 13
Прыпавесць ........ 14
Летняя ноч ........ 15
Вечаровая малітва закаханых ........ 16
Строфы ........ 17
Верашчагін ........ 18
Сялянскі «Ойча наш» ........ 20
Свабода ........ 22
Пастэль ........ 23
Notturno ........ 24
Andante ........ 25
Apassionato ........ 26
Ікар ........ 27
*** (Мкнуць хмары паўз вяршыні гор...) ........ 28
Песня (Цябе я затуліць хачу ўсім целам...) ........ 30
Ідылія могілак ........ 31
Казалі: змрок ідзе... ........ 32

Снегу, што падае... 33
*** (Па кропельку мілосці я на светакрай...) 34
Апастрофа 35
Уверцюра 37
*** (Цень цьмяны на рацэ...) 38
*** (Сказаў бы толькі я...) 39
*** (О, тыя дні цудоўныя...) 40
*** (Мае абдоймы – для цябе...) 41
Каля Лабы 42
Песня Дзень ледзь чутным напевам... 43
У прысадах каштанаў 44
Вечар 45
Снег 46
Міла 47
Над прадоннем 48
Мелодыя 49
Песня (Ах, жаль і скруха мкнецца да людзей...) 50
Інтымныя імгненні 51
Інтымныя строфы 52
Сэрца чалавека 53
Паэт і філолаг 54
Сэрца 55
Гераклу 56
Малітва перад сном 58
Пастараль 59
Веснавыя імгненні 60
*** (Ты, мілосць, нанесла рану сэрцу...) 61

Конь ........................................................ 62
Будучым паэтам .......................................... 64
Дзеці дэкадансу ........................................... 65
Адказ ....................................................... 66
Роздум ...................................................... 67
Вабноты жанчын ........................................... 68
Працяг ...................................................... 69
Да вольнае думкі .......................................... 70
Праз гады .................................................. 71
Пацвельванне ............................................... 72
Восень кахання ............................................ 74

У серыі «Паэты планеты»,
акрамя выбраных вершаў Яраслава Вырхліцкага,
таксама ёсць у продажы:

**Сапфо «Песні»**
**Франчэска Петрарка «Выбраныя песні з «Канцаньерэ»**
**П'ер дэ Рансар «Выбраныя вершы»**
**Ўільям Шэкспір «Выбраныя санеты»**
**Ёган Вольфганг Гётэ «Выбраная паэзія»**
**Габрыэла Містраль «Выбраныя вершы»**
**Умар Хаям «Выбраныя рубаі»**
**Шарль Бадлер «Выбраныя вершы»**
**Райнэр Марыя Рыльке «Выбраная лірыка»**
**Фрыдрых Гёльдэрлін «Выбраная паэзія»**
**Генрых Гайнэ «Выбраныя вершы»**
**Гіём Апалінэр «Выбраная паэзія»**
**Эдгар По «Выбраныя вершы»**
**Федэрыка Гарсія Лорка «Выбранае»**
**Джон Кітс «Выбранае»**
**Рыгор Барадулін «Перавыбранае»**
**Дзімча Дэбялянаў «Выбранае»**
**Гай Валерый Катул «Выбраныя вершы»**
**Ян Каханоўскі «Выбраныя вершы»**

Па пытаннях набыцця кніг
серыі «Паэты планеты» звяртайцеся:
paety.planiety@gmail.com
Тэл./факс (17) 267.48.71, маб. (29) 623.35.65.

**Вырхліцкі**, Я.

В92 Выбраная паэзія / Яраслаў Вырхліцкі ; пер. з чэшскай Лявона Баршчэўскага. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2017. — 80 с. (Паэты планеты).

ISBN 978-985-7164-49-3.

Яраслаў Вырхліцкі (або Врхліцкі; 1853–1912) – чэшскі паэт; быў адным з лідараў чэшскай паэтычнай суполкі «Лумір», якая сваёй мэтай ставіла прышчапленне на нацыянальным грунце досведу найбуйнейшых еўрапейскіх літаратур таго часу.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**УДК 821.162.3-1**
**ББК 84(4Чех)-5**

Серыя «Паэты планеты»

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Яраслаў Вырхліцкі

**ВЫБРАНАЯ ПАЭЗІЯ**

Дызайн *Марціна Русецкага.*
Рэдактар *Зміцер Колас.*

Падпісана ў друк 6.03.2017. Фармат 60×90 $^{1}/_{32}$.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ул.-выд. арк. 1,51. Ум. друк. арк. 2,50.
Наклад 500 асобнікаў.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.